**24.** Вызначце прыклады, у якіх часціца *ані* пішацца разам?

*1) ані..куды; 2) ані..што; 3) ані..як; 4) ані..хто.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**25.** Якія сказы з прапанаваных запісаны правільна?
*1) На палянцы, засеянай аўсом, стаяў дом лесніка.*
*2) Неба зацягнутае хмарамі хмура пазірала на зямлю.*
*3) Абноўленая вясной зямля дае незлічоныя багацці.*
*4) Засланы саматканым абрусам стол стаяў пасярод пакоя.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**26.** Да якой групы адносяцца злучнікі *хоць, няхай*?

**А)** тлумачальныя. **Б)** прычынныя. **В)** умоўныя.
**Г)** уступальныя. **Д)** выніковыя.

**27.** Якія марфалагічныя спосабы выкарыстоўваюцца пры ўтварэнні прыслоўяў? Выберыце патрэбныя варыянты з дадзеных:

*1) прыставачны; 2) суфіксальны; 3) прыставачна-суфіксальны;*
*4) суфіксальна-постфіксальны; 5) адвербіялізацыя.*

**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 4. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**28.** Размеркаванне слоў па часцінах мовы адбываецца паводле:

*1) агульнасці граматычных катэгорый; 2) асаблівасці словазмянення;*
*3) спалучальнасці з іншымі словамі;*
*4) падабенства асноўных сінтаксічных функцый.*

Вызначце правільныя варыянты.

**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 4. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**29.** Літаратурным псеўданімам *Шаўцы* карысталіся ў беларускай літаратуры: *1) Паўлюк Трус; 2) Пятро Глебка; 3) Барыс Сачанка; 4) Уладзімір Дубоўка.* Выберыце правільныя варыянты.

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**30.** Хто з вядомых мастакоў слова з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў:

*Мой родны Мінск,*
*Пад небам жураўліным*
*Жыві, квітней пад зоркай залатой.*

**А)** Пятрусь Броўка. **Б)** Анатоль Вялюгін. **В)** Максім Танк.
**Г)** Алесь Ставер. **Д)** Пімен Панчанка.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218; тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53;
e-mail: info@bakonkurs.by; http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 11. Тыраж 28100 экз. г. Мінск. 2012 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2012»

*Чацвер, 16 лютага 2012 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Разгадайце загадку: *яна засцілае дол ігліцай, спрадвеку славіцца жывіцай.*

**А)** бяроза. **Б)** асіна. **В)** сасна. **Г)** вярба. **Д)** таполя.

**2.** Як у народзе называюць свята, якое адзначаюць, калі на полі дажаты апошні сноп?

**А)** Жніво. **Б)** Таўкачыкі. **В)** Калоссе. **Г)** Багач. **Д)** Пакровы.

**3.** У якіх словах з дадзеных устаўце на месцы пропуску літару **э**?

*1) ..маль; 2) зр..нка; 3) фат..ль; 4) д..клараваць; 5) амат..р.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** ва ўсіх словах, акрамя 5.
**Г)** 1, 4, 5. **Д)** 2, 3.

**4.** Вызначце, якія з дадзеных дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу ўтвораны правільна:

*1) цёрты; 2) выцерлы; 3) зацёрты; 4) зацёрлы.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3.
**Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**5.** Дадзены словазлучэнні:

*1) дубовы ліст; 2) вавёрчыны арэхі; 5) марозны вецер.*

Выберыце словазлучэнне з прыналежным прыметнікам.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**6.** Як называлі даўней у народзе апекуна земляробства?

**А)** Дажбог. **Б)** Зюзя. **В)** Жыжаль. **Г)** Ярыла. **Д)** Пярун.

**7.** Які адпаведнік у беларускай мове мае ўстойлівае спалучэнне з рускай мовы *как песку морского*?

**А)** як былінка ў полі. **Б)** як ніколі нічога. **В)** як у прысаку.
**Г)** як зорак на небе. **Д)** як на цвіках.

**8.** Дадзены сказы: *1. Усе выпускнікі _ смеючыся _ паселі за парты.*
*2. Углядаючыся ў першую снежную раніцу _ яна яшчэ даўгавата стаяла на ганку.*
*3. Але _ не вытрымаўшы _ зноў узяўся за фарбы і пачаў маляваць.*
У якім(-іх) сказе(-ах) на месцы пропуску неабходна паставіць коскі?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2. **Д)** 3.

**9.** Лічэбнік ***сто трыццаць сем*** – … .

**А)** колькасны зборны. **Б)** колькасны складаны. **В)** колькасны састаўны.
**Г)** колькасны. **Д)** парадкавы просты.

**10.** Колькі прыслоўяў ужыта ў вершы Янкі Журбы “У ясны дзень”?

*Яснасць сонца, лёгкі ветрык,*
*У паветры звон,*
*Пах ад жыта, пах ад кветак, –*
*Дзіўна ўсё, як сон.*

*Каля нас пяшчотна, ціха*
*Шэпчуць каласы,*
*А над намі льюцца срэбрам*
*Птушак галасы.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**11.** У якім творы мастак слова напісаў пра свайго героя: *“Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы…”*?

**А)** Якуб Колас “Сымон-музыка”. **Б)** Максім Багдановіч “Музы□ка”.
**В)** Віктар Шніп “Паэзія”. **Г)** Янка Купала “Курган”.
**Д)** Янка Брыль “Сірочы хлеб”.

**12.** Усім вядомы з маленства літаратурныя героі:

*1) Тубі; 2) Карлсан; 3) Мышка Пік-Пік; 4) Бураціна; 5) Айвенга.*

У творах пісьменнікаў з якіх краін яны з’явіліся? Знайдзіце правільныя варыянты: *а) Беларусь; б) Данія; в) Англія; г) Швецыя; д) Італія.*

**А)** 1-д, 2-в, 3-б, 4-г, 5-а. **Б)** 1-б, 2-а, 3-д, 4-г, 5-г. **В)** 1-в, 2-б, 3-б, 4-а, 5-д.
**Г)** 1-а, 2-г, 3-а, 4-д, 5-в. **Д)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б, 5-д.

**13.** Дадзены словы: *1) малацьба; 2) дзядзька; 3) сцежка; 4) пясчаны.*
Выберыце словы, у якіх напісанне адпавядае вымаўленню.

**А)** усе словы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3, 4. **Д)** 2, 4.

**14.** Якім членам сказа з’яўляюцца выдзеленыя ў сказе словы?
*Дзядуля акуратна вы□разаў некалькі бярозавых пруткоў, звязаў іх тонкімі канцамі і нанізаў цэлыя* ***чатыры маністы баравікоў****.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем. **Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**15.** Выберыце з прапанаваных словы, у якіх гукаў больш, чым літар:

*1) раён; 2) рэдзька; 3) уюн; 4) дзераза; 5) носьбіт.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**16.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце апостраф?

*1) вада..ём; 2) нізоў..е; 3) кап..ё; 4) п..едэстал.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** У якіх словах з прыведзеных на месцы пропуску патрэбна напісаць літару *э*?

*1) пр..нтар; 2) шт..псель; 3) гр..йдар; 4) ад..птар; 5) гр..фель.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4, 5.

**18.** Як сказаць адным словам пра тое, што якую-небудзь расліну трэба зрабіць прыдатнай да пэўных умоў?

**А)** планаваць. **Б)** акліматызаваць. **В)** сістэматызаваць.
**Г)** паразітаваць. **Д)** фарміраваць.

**19.** Вучань не ўспомніў дату, каб правільна напісаць лічэбнік у сказе:

*Першая лінія метро ў Мінску была пушчана ў … годзе.*

Якую дату не ўспомніў вучань?

**А)** 1982. **Б)** 1983. **В)** 1984. **Г)** 1985. **Д)** 1986.

**20.** Падбярыце сінонім з прапанаваных слоў да слова ***кусок***.

*1) узвышша; 2) астатак; 3) кавалак.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**21.** Вызначце з дадзеных сказ, у якім правільна пастаўлены знакі прыпынку:
*1) Гэтага юнака ўсе ведалі, як чалавека з вялікай фантазіяй.*
*2) Імёны мастакоў слова Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, быццам тры яркія зоркі, і сёння зіхацяць на літаратурным небасхіле Беларусі.*
*3) Яны пачалі адчуваць сябе зусім, як дарослыя людзі.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Вучні зрабілі гукавы запіс слоў: *1) [дз’энь]; 2) [в’асна]; 3) [с’м’эх].*
У запісе якога слова яны дапусцілі памылку?

**А)** ва усіх словах дапушчаны памылкі. **Б)** усе словы запісаны правільна.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**23.** Дадзены запазычаныя словы:

*1) антракт; 2) аргумент; 3) галкіпер; 4) аратар.*

Якія ёсць адпаведнікі ў беларускай мове? Вызначце правільныя варыянты:

*а) прамоўца; б) перапынак; в) варатар; г) доказ.*

**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** 1-г; 2-б; 3-а; 4-в. **В)** 1-в; 2-г; 3-а; 4-б.
**Г)** 1-а; 2-в; 3-г; 4-б. **Д)** 1-б; 2-г; 3-в; 4-а.